ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама
Л.М.Сцяпанаў

”30“ кастрычніка 2013 года

# ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

## 9 клас

Сяргей Грахоўскі

* * *

Чалавеку патрэбна не слава,
А людская увага і ласка,
І сардэчнае шчырае слова,
І вясёлая добрая казка.

Чалавеку патрэбна усмешка
Незнаёмых вачэй і знаёмых,
Каб дажджамі размытая сцежка
Стала лёгкай на кручах і стромах.

Чалавеку не трэба спагады, -
Дабрата чалавеку патрэбна,
Каб, мінаючы прорвы і спады,
Узбірацца на стромкія грэбні,

Каб сяброў сустракаў клапатлівых
На дарогах, далёкіх ад дому,
І каб сам быў заўсёды шчаслівы,
Калі шчасце прыносіш другому.

*Шыфр удзельніка*

___________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні абласнога
арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік начальніка ўпраўлення
адукацыі Віцебскага аблвыканкама
Л.М.Сцяпанаў
”30“ кастрычніка 2013 года

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры
# 9 клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Назавіце дні тыдня, у назвах якіх прысутнічаюць пералічаныя гукі.

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

| Гукі | Дзень тыдня |
|---|---|
| 2 зычныя санорныя гукі,<br>2 зычныя мяккія гукі,<br>2 зычныя зацвярдзелыя гукі | |
| 1 зычны губны гук,<br>1 зычны зацвярдзелы гук,<br>1 зычны санорны гук | |
| 1 зычны санорны гук,<br>2 зычныя мяккія гукі,<br>2 зычныя глухія гукі | |

**Заданне 2.** Упішыце літары **з**, **с** або **ш**.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

Бру .. чатка, зра .. чэнне, рэ .. чыцкі, у .. чаць, ні .. чымны, по .. чак, падма .. чык, выпе .. чаны, пя .. чанік, ро .. чына.

**Заданне 3.** Запішыце прыведзеныя словы ў патрэбны слупок табліцы:
*пайшоў, двое, дзевяноста, жар-птушка, лёгка, жоўта-зялёны, канапа-ложак, маэстра, радыё, пяцьдзясят.*

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| Словы з асновай на зычны гук | Словы з асновай на галосны гук | Словы з дзвюма асновамі (двума канчаткамі) |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 4.** Запішыце параўнанні з наступнымі словамі.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

______________________________ , як рунь;

______________________________ , як лунь;
______________________________ , як чэмер;
______________________________ , як кнот;
______________________________ , як бурбалка.

**Заданне 5.** Падкрэсліце дзеепрыслоўныя формы, якія не адпавядаюць граматычным нормам сучаснай беларускай мовы. Запішыце іх правільна.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

Казаўшы, несучы, полячы, асвятляючы, сустрэўшыся, бяручы, косячы, рэжачы, радуючыся, жнучы, хадзіўшы.

_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________

**Заданне 6.** Перакладзіце на беларускую мову. Расстаўце націскі ў назоўніках.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| У рускай мове | Па-беларуску |
|---|---|
| рты | |
| листья | |
| трактора | |
| деятели | |
| макароны | |

**Заданне 7.** Назавіце від сувязі ў словазлучэннях.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| Словазлучэнне | Від сувязі |
|---|---|
| яго мара | |
| з’еўшы апельсін | |
| гладкая паверхня | |
| утрая дужэй | |
| просьба выклікаць | |
| якісьці ўрач | |
| далей за ўсё | |
| пазначаны алоўкам | |
| тры нумары | |
| зайсці не павітаўшыся | |

**Заданне 8.** Узнавіце прапушчаныя фрагменты тэксту. Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

У аснове сучаснага беларускага алфавіт.. ляжыць __________________________ – старажытная славянская азбука. На Русі яна пачала пашырацца ў X–XI стст. у сувязі з прыняц..ем хрысці..нства і з..яўленнем б..гаслужэбных кніг на (стара) славянскай мове, а з XIII–XIV стст. яна выкарыстоўваецца і ў беларускім піс..менстве. Да XVI ст. гэтае піс..мо было толькі рукапісным. Эпоха кнігадрукавання ва ўсходніх славян пачалася з ________ года, калі вядомы вучоны, (усходне) славянскі першадрукар ________________________________ стварыў на яго аснове шрыфт і надрукаваў 23 кнігі “Бібліі рускай”.

**Заданне 9.** Падкрэсліце “чацвёртае” лішняе.

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

*Эпітэты:* гайдаецца маладзік, маладзік вастраносы, маладзік-жартаўнік, жоўты маладзік.

*Метафары:* далоні клёну, загарыцца клён, клён абгарэлы, клён маўчаў.

*Параўнанні:* матылёк як чароўны ветрык; уецца сінякрылы матылёк; думкі ляцелі матылькамі; нібы ліст, трапеча матылёк.

**Заданне 10.** Аднавіце парадак слоў у вершы і пастаўце знакі прыпынку. Назавіце аўтараў гэтых радкоў.

*Максімальная колькасць балаў – **8**.*

| | |
|---|---|
| людское простае шчасце | |
| як і наша з табою так | |
| з солі складаецца пэўна | |
| ў полі з хлеба сабранага | |
| | Аўтар – |
| дарагая сэрцам абуджаная бывай | |
| зразумець я не магу так горка чаму | |
| што ў небе заранкі мне шкада дагарае | |
| якому дня майго ружавець на ўсходзе | |
| | Аўтар – |
| казкі-сны баюць мне аб ёй | |
| праталіны вясеннія | |
| шэлест і верасны лесу | |
| і дуб апалены ў полі | |
| | Аўтар – |
| але час нам наступае расстацца | |
| ужо такая ў нас доля пэўна | |
| цябе кахаў дарагая я моцна | |
| нам час расстацца але | |
| | Аўтар – |